**М. І. СЯНКЕВІЧ**
Брэст, УА “БрДУ імя А. С. Пушкіна”

## МЕТОДЫКА ПРАЦЫ НАД ЭМАЦЫЯНАЛЬНА-ВОБРАЗНАЙ І ЛАГІЧНАЙ ВЫРАЗНАСЦЮ ЧЫТАННЯ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ АПАВЯДАННЯЎ

Навучанне малодшых школьнікаў чытанню вядзецца на матэрыяле твораў, разнастайных па форме і змесце. Самы распаўсюджаны ў дзіцячым чытанні жанр літаратуры – апавяданні (больш за 30 %). У падручніках для пачатковых класаў змешчаны гісторыка-біяграфічныя, сацыяльна-бытавыя, гумарыстычныя апавяданні, а таксама апавяданні прыродаапісальнага зместу. Характэрная рыса апавяданняў, рэкамендаваных для дзіцячага чытання, – невялікая колькасць персанажаў, актыўнае дзеянне і выразная матывацыя паводзін дзеючых асоб.

Мэта артыкула – вызначыць, у якой ступені праца над эмацыянальна-вобразнай і лагічнай выразнасцю чытання ў працэсе ўспрымання і аналізу мастацкага твора спрыяе глыбіні асэнсавання малодшымі школьнікамі аўтарскай задумы і разуменню аўтарскай пазіцыі. Прасочым працу ў абазначаных вышэй напрамках на розных этапах вывучэння мастацкага твора на ўроку.

Падрыхтоўчая праца поўнасцю абумоўлена ідэйна-эстэтычным зместам апавядання, якое будзе чытацца. Яе асноўнае прызначэнне – абудзіць, актуалізаваць жыццёвыя эмоцыі, веды, мысленне – усё тое, што спатрэбіцца для паўнавартаснага ўспрымання твора. Падрыхтоўчая праца, акрамя ўсяго, павінна выклікаць у дзяцей цікавасць да таго, што будзе чытацца.

Перад чытаннем сюжэтнага апавядання часцей за ўсё выкарыстоўваюцца наступныя віды працы:

*Слова настаўніка.* Гэтым відам працы трэба карыстацца тады, калі ў апавяданні размова ідзе пра падзеі, што адбываліся раней, пра жыццё людзей у іншых краінах і г. д. Слова настаўніка выдатна спалучаецца з нагляднасцю. Добра, калі ў руках педагога будуць кнігі, альбомы, фотаздымкі, узоры народнага мастацтва і інш.

*Свабоднае выказванне дзяцей пра вядомыя ім падзеі.* У гэтым выпадку настаўнік стварае праблемную сітуацыю, а навучэнцы ў адпаведнасці з ёю расказваюць пра тое, што ім вядома. Напрыклад, калі будзе чытацца апавяданне пра сяброўства, настаўнік кажа: “Уявіце, што вы захварэлі, а сябар ніводнага разу вас не праведаў і не пазваніў. Што вы скажаце яму пры сустрэчы?” Ці яшчэ: перад тым, як будзе чытацца апавяданне пра тое, якую карысць прыносяць птушкі, настаўнік пытае: “А чаму нельга знішчаць тых птушак, ад якіх чалавек не мае карысці?”

*Гутарка настаўніка з вучнямі па пытаннях.* У дадзеным выпадку настаўнік распрацоўвае сістэму пытанняў, адказваючы на якія вучні рыхтуюцца да ўспрымання твора.

*Гутарка настаўніка па матэрыялах экскурсій і ўласных назіраннях дзяцей.* Выкарыстанне гэтага віду ўступнай працы будзе паспяховым, калі настаўнік падчас запланаваных экскурсій па прыродазнаўстве ці спецыяльных экскурсій, звязаных з урокамі чытання, мэтанакіравана па спецыяльных заданнях звяртае ўвагу дзяцей на тыя з'явы і асаблівасці, якія будуць патрэбнымі на адпаведных уроках. Так, чытаючы апавяданні і вершы пра восень, дзеці сустрэнуцца ў іх з апісаннем восеньскай лістоты, колеру неба, гукаў і пахаў восені. За ўсім гэтым (і многа чым яшчэ) можна паназіраць на экскурсіі.

Калі будзе чытацца апавяданне апісальнага характару, можна задзейнічаць такія віды працы, як *выкарыстанне рэпрадукцый малюнкаў жывапісу, праслухоўванне фрагментаў музычных твораў.*

У любым выпадку падрыхтоўчая праца да ўспрымання апавядання непрацяглая. Яго пачатак адразу павінен прыцягнуць увагу вучняў. Для гэтага неабходна, каб у голасе настаўніка гучала зацікаўленасць, інтрыга, імкненне паведаміць слухачам нешта займальнае. Нельга перад чытаннем апавядання пераказваць яго змест. Некаторыя метадычныя дапаможнікі для пачатковай школы рэкамендуюць настаўніку да пачатку чытання ставіць перад вучнямі пытанні. На нашу думку, гэта паслабляе цэласнасць і пачуццёвасць успрымання. Юныя чытачы абавязаны будуць паралельна з успрыманнем ажыццяўляць лагічныя аперацыі па вылучэнні, супастаўленні, параўнанні розных з'яў.

Вельмі важна, каб першае чытанне апавядання настаўнікам было выразным, бо чым выразней настаўнік прачытае тэкст, тым лепш данясе ён да свядомасці вучняў сюжэтную лінію твора, вобразы, ідэю, тым больш гэты твор паўплывае на пачуцці дзяцей. Эмацыянальныя апавяданні з дыялогамі лепш прачытаць настаўніку, асабліва ў 2–3 класах.

Выразнае чытанне ўсяго твора праводзіцца на апошніх этапах урока. Гэтаму папярэднічае аналіз яго прадметнага зместу, вызначэнне сэнсавых сувязей у тэксце (часава-прасторавых, паслядоўных, прычыннавыніковых). Ключавая ўвага надаецца характарыстыцы галоўнага героя. Аналіз вобразу героя вучыць разбірацца ў тым, як пісьменнік адлюстроўвае дзеючых асоб, адкрывае тое, што схавана ад вачэй: думкі і пачуцці персанажаў, рысы іх характару. Такі аналіз выпрацоўвае звычку даваць ацэнку асноўных якасцяў герояў не толькі па ўчынках, але і па матывах, якія іх выклікалі. Апошняе, на нашу думку, даецца малодшым школьнікам асабліва цяжка.

Пытанні і заданні настаўніка, якія дапамагаюць вучням асэнсаваць вобраз галоўнага героя, могуць быць пададзены ў наступнай паслядоўнасці:

1. Хто з'яўляецца галоўным героем апавядання? Ці спадабаўся ён табе? Пералічы асноўныя рысы характару героя, які табе спадабаўся. (Калі герой не спадабаўся, вучні таксама абгрунтоўваюць свой пункт погляду.)

2. Знайдзі ў тэксце апісанне знешняга выгляду героя (яго твар, постаць, адзенне). Калі не знойдзеш, зрабі гэта па ўяўленні. Для вызначэння ролі партрэтнага апісання ў агульнай задуме твора, у характарыстыцы вобраза-персанажа мэтазгодна выкарыстоўваць наступныя пытанні: Якія рысы характару героя знайшлі адлюстраванне ў яго партрэце? Чаму вы так рашылі? Якія словы тэксту навялі вас на гэтую думку? Як адносіцца аўтар да свайго персанажа? З якіх слоў гэта вынікае?

3. Як гаворыць герой? Знайдзі ў тэксце аўтарскае апісанне мовы (калі яно ёсць).

4. Успомні, у якіх учынках, думках, дзеяннях лепш за ўсё раскрываецца тая ці іншая рыса характару героя.

5. Раскажы аб узаемаадносінах героя з іншымі персанажамі апавядання.

6. Як сам аўтар ставіцца да свайго героя? Падмацуй свой адказ словамі тэксту.

У большасці сюжэтных апавяданняў на першы план выступаюць узаемаадносіны некалькіх герояў. Менавіта на гэтым будуецца ўсякае дзеянне ў эпічным творы. Неабходна, каб дзеці зразумелі матывацыю, прычыны паводзін персанажаў, бо на аснове аналізу ўзаемадзеяння вобразаў выяўляецца ідэя твора.

У апавяданнях апісальнага характару асаблівае значэнне набывае мова твора. Словамі-арыенцірамі, на аснове якіх вядзецца аналіз такіх апавяданняў, будуць вобразныя азначэнні, якія "ажыўляюць" малюнкі прыроды, ствараюць агульны – мажорны ці мінорны – настрой апавядання. Аналізуючы творы пра родную прыроду, неабходна актыўна абапірацца на ўражанні і мэтанакіраваныя назіранні, якія мелі месца падчас экскурсій.

Адным з асноўных прыёмаў, які дапамагае настаўніку арганізаваць працу па навучанні малодшых школьнікаў складанню элементарных характарыстык дзеючых асоб, з'яўляецца супастаўленне герояў аднаго твора або блізкіх па тэматыцы твораў. Пры параўнанні і супастаўленні ўдакладняецца аўтарскае стаўленне да сваіх персанажаў. Для гэтага могуць быць выкарыстаны творы як аднаго, так і розных аўтараў. Абавязковая ўмова адбору тэкстаў для такога ўрока – наяўнасць у іх, акрамя супрацьпастаўлення, падабенства тэмы, пачуццяў, настрояў.

Усю работу над аналізам тэксту павінны пранізваць разважанні пра адносіны вучняў да прачытанага, а таксама адносіны да іх самога аўтара.

Аўтарскае стаўленне да герояў, іх узаемаадносін, да падзей важна раскрываць паступова. Вылучаецца шэраг прыёмаў для выяўлення аўтарскіх адносін да дзеючых асоб:

1) настаўнік сам характарызуе стаўленне аўтара да героя, а вучні пацвярджаюць гэта з дапамогай тэксту;

2) настаўнік звяртае ўвагу дзяцей на аўтарскія словы, якія ўскосна характарызуюць героя, вучні "расшыфроўваюць" тое ці іншае дзеянне, выраз твару, інтанацыю героя і на гэтай падставе вызначаюць характар адносін аўтара да персанажа;

3) пры адсутнасці рэмарак аўтара вучні прыдумваюць іх сумесна з настаўнікам.

Характар вобраза-персанажа можа раскрывацца не толькі праз апісанне яго ўчынкаў, знешняга выгляду, але і праз яго характарыстыку іншымі дзейнымі асобамі, праз самахарактарыстыку, праз пейзажныя апісанні, праз паказ інтэр'еру.

Аналіз сюжэтнага твора немагчымы без ацэнкі малодшымі школьнікамі паводзін персанажаў. Зрабіць гэта юным чытачам дапамагае ўласны эмацыянальна-пачуццёвы вопыт, маральныя пачуцці, якія нараджаюцца на глебе яго асэнсавання. Учынкі герояў перадаюцца ў адпаведнасці з іх характарам і паводзінамі.

Як у працэсе аналітычнай працы над тэкстам апавядання, так і ў працэсе падрыхтоўкі да выразнага чытання яго частак (ці ўсяго тэксту, калі ён невялікі) настаўнік звяртае ўвагу вучняў на захаванне граматычных, лагічных і псіхалагічных паўз, пастаноўку лагічнага націску. Паралельна ідзе праца над інтанацыяй і тэмпам чытання. Прачытаць выразна дапаможа і складзеная калектыўна партытура.

У большасці сюжэтных твораў сустракаецца дыялог. Своеасаблівасць распрацоўкі сродкаў выразнага чытання апавяданняў з дыялогам заключаецца ў тым, што чытальніку патрэбна не толькі "прысвоіць" словы аўтара і падзяліцца са слухачамі яго думкамі і пачуццямі, але і знайсці моўную характарыстыку гучання слоў кожнага героя, г. зн. знайсці неабходныя сродкі выразнасці для перадачы асаблівасцей мовы герояў.

Чытанне па ролях можа выкарыстоўвацца пры праверцы дамашняга задання, пры паўторным перачытванні тэксту. Яно карыснае ў тым плане, што дапамагае вучням глыбей адчуць характар персанажа менавіта праз яго мову. Перад вучнем узнікае неабходнасць выбраць правільны тэмп чытання, абазначыць голасам лагічныя паўзы і націскі, перадаць эмацыянальны змест рэплік. А ўсё гэта будзе зроблена правільна, калі чытач зразумее характар героя. Чытанне па ролях выкарыстоўваецца як у працэсе аналізу мастацкіх твораў (асобныя дыялогі), так і пасля высвятлення ідэйна-эстэтычнага зместу твора. Яно патрабуе *абавязковай* падрыхтоўкі. Кожны вучань павінен ведаць, *што* яму чытаць і *як* чытаць.

Рыхтуючы клас да чытання па ролях, настаўнік выступае як рэжысёр і пачынае сваю працу з таго, што абмяркоўвае з дзецьмі характары вобразаў-персанажаў. Пасля гэтага трэба выбраць выканаўцаў адпаведных роляў. Педагог можа зрабіць гэта сам, а можна выкарыстаць дапамогу класа, бо дзеці ведаюць, хто лепш за іншых выканае ролю зайца, лісы, воўка ці іншых персанажаў. Затым даецца 4–5 хвілін на падрыхтоўку. Чытальнікі адзначаюць у падручніку свае рэплікі, рыхтуюцца вымаўляць іх услых. Толькі пасля гэтага мэтазгодна пачынаць "рэпетыцыю". Чытальнікі-дублёры прапануюць свае варыянты "агучвання" роляў.

Для чытання па асобах бярэцца не ўвесь тэкст, а толькі яркая, эмацыянальная яго частка. Як вядома, дыялог звычайна суправаджаецца словамі аўтара, у якіх падаюцца парады, як вымаўляць адпаведную рэпліку. Пры чытанні па ролях аўтарскія словы выключаюцца з тэксту, не чытаюцца, але яны дапамагаюць вучню правільна выканаць сваю ролю.

Такім чынам, каб прачытаць выразна, трэба зразумець галоўную думку твора, характэрныя асаблівасці яго персанажаў, адносіны аўтара да герояў. А яшчэ вельмі важна развіць у вучняў уменне эмацыянальна перадаваць уласнае разуменне зместу мастацкага твора.

**О. А. ТЕЛЯТИЦКАЯ**
Пинск, ГУО «Средняя школа № 9 г. Пинска»

## «ОБЛАКО СЛОВ» КАК СРЕДСТВО ПОВЫШЕНИЯ ПОЗНАВАТЕЛЬНОЙ АКТИВНОСТИ В ПРОЦЕССЕ ОБУЧЕНИЯ МЛАДШИХ ШКОЛЬНИКОВ

Для современного мира характерно постоянное увеличение потоков информации и ограниченность времени для работы с ней. Сегодня информация – важный базовый компонент личностного развития каждого человека. И чем полнее будут реализованы потенциальные возможности человека, тем больших успехов личность сможет добиться в жизни.

В школьной системе образования всегда использовали различные способы графического отображения учебного материала. Ценно использование наглядности не только для активизации процесса обучения, но и для проявления познавательной деятельности школьников. Иллюстрированный учебный материал позволяет развить способность не только образного, но и абстрактного и логического мышления.

Одной из эффективных технологий активизации обучения является метод визуализации учебной информации [1].

На сегодняшний день известно значительное число визуальных средств передачи информации: доска, плакаты, схемы, мультимедийный